УДК 821.161.3.0.(043)+141.32

# Праблема свабоды ў творчасці Васіля Быкава

**Ю. А. Каламійцава**, аспірант*

*У артыкуле праводзіцца параўнальны аналіз твора В. Быкава «Труба» і твораў французскіх экзістэнцыялістаў. Асаблівая ўвага надаецца праблеме свабоды і адказнасці ў творчасці аўтара. Значнае месца адводзіцца экзістэнцыяльнай накіраванасці творчасці В. Быкава.*

# The Problem of Freedom in the Works of Vasil Bykau

**Y. Kalamiytsava**, Postgraduate Student

*The philosophical analysis of V. Bykau works is studied in this article. Grave attention is given to the existentialistic sense of V. Bykau works and problems of freedom and responsibility in the work «The Pipe».*

Васіль Быкаў – першы беларускі пісьменнік, пра якога пачалі гаварыць як пра пісьменніка-экзістэнцыяліста. Экзістэнцыяльная традыцыя нарадзілася з літаратурна-філасофскіх разважанняў Дастаеўскага, Ніцшэ і К'еркегора і працягнула сваё развіццё ў п'есах і апавяданнях Сартра і Камю. Яшчэ ў сваёй ранняй творчасці Камю і Сартр, апіраючыся на філасофскую сістэму Дастаеўскага, сцвярджалі адчужэнне чалавека ад грамадства. Такі чалавек быў «не ў фармаце» існуючых норм і законаў, быў, гаворачы словамі Дастаеўскага, адрэзаны, «як нажніцамі», ад усіх і ўсяго. Адчуванне ўласнай свабоды рабіла героя «чужынцам» для ўсяго свету. У беларускай літаратуры да «праклятых пытанняў» звярталіся многія пісьменнікі, але да экзістэнцыяльных аўтараў адносяць Максіма Гарэцкага, Васіля Быкава і ў пэўнай ступені Уладзіміра Караткевіча. Чым жа быў выкліканы зварот шматлікіх аўтараў да экзістэнцыяльных феноменаў свабоды, выбару, адказнасці?

Зварот пісьменнікаў да экзістэнцыяльнай тэматыкі ў літаратуры мінулага стагоддзя з'яўляецца вынікам змянення агульнай карціны свету ў чалавечай свядомасці. Новая свядомасць у чалавеку сфарміравалася праз падзеі канца XIX – пачатку XX ст. Шматлікія войны і рэвалюцыі, разбурэнні і тэхнічны прагрэс, які адмовіў значнасць чалавека і замяніў яго машынамі, паставілі чалавека ў новыя абставіны, у якіх пануе адчай і няўпэўненасць. Усё радзей чалавек звяртаецца да Бога і часцей спадзяецца толькі на самога сябе, адмаўляючы грамадства, якое стала ему варожым.

Асаблівасць быкаўскай прозы апошняга перыяду творчасці характарызуецца ярка выражанай экзістэнцыяльнай накіраванасцю, у адрозненні ад ранняга перыяду, дзе толькі нараджалася экзістэнцыяльная тэматыка. У яго творчасці нават існуе ярка выражанае стылёвае і моўнае падабенства да экзістэнцыяльных твораў. Апавяданні В. Быкава не толькі, як і творы Сартра, Камю і Дастаеўскага, напісаны ў філасофскай форме або ў форме прытчы, але маюць і аднолькавае сэнсавае гучанне, нават у назвах: «Мёртвыя без пахавання» і «Сцяна» (інакш «Мур») у Сартра і «Мёртвым не баліць» і «Сцяна» ў Быкава, раман «Бедныя людзі» Дастаеўскага і апавяданне «Бедныя людзі» Быкава. Дарэчы, трэба ўзгадаць, што В. Быкаў з вялікай пашанай адносіўся да экзістэнцыяльнай філасофіі і нават у сваіх успамінах у кнізе «Доўгая дарога дадому» ўзгадвае, што пад час кангрэса КОМЭСАў Рыме слухаў выступленні Сартра, які яго ўразіў «сваім філязофскім экспромтам пра экзістэнцыялізм» [1, с. 242].

Калі ранні перыяд творчасці Быкава вызначаецца рэалістычнасцю так званай лейтэнанскай прозы, то проза 90-х і 2000-х гг. у сваёй метафарычнасці і прытчавасці з'яўляецца сімвалічнай, як і творы французскіх экзістэнцыялістаў. Асаблівае месца ў творчасці В. Быкава займае праблема свабоды. У апошнія гады Быкаў стварае шэраг кароткіх апавяданняў, у якіх чалавек або цэлая грамада пастаўлены ў сітуацыю, выйсце з якой вызначаецца ўласным выбарам. Быкаўскія героі заўсёды пастаўлены аўтарам у складаную сітуацыю паміж жыццём і смерцю. Сітуацыю, калі выбарам з'яўляецца рашэнне «быць чалавекам ці перастаць існаваць».

Перавага філасофскіх разважанняў у літаратурнай форме дае падставу для глыбокага аналізу экзістэнцыяльных матываў у беларускай літаратуры. Праблема свабоды з'яўляецца адной з вядучых тэм у экзістэнцыяльнай філасофіі. Але ў творчасці В. Быкава, ды і ў беларускай літаратуры ўвогуле, дадзеная тэма часта заставалася па-за межамі філасофскіх разважанняў.

* Навуковы кіраўнік — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт І. І. Ляшчынская.

Такім чынам, мэтай дадзенай працы з’яўляецца аналіз праблемы свабоды ў творчасці В. Быкава. Асноўныя задачы – на аснове параўнальнага аналізу ідэй свабоды ў творы В. Быкава «Труба» з творамі французскіх экзістэнцыялістаў выявіць асаблівасці быкаўскай прозы і рэпрэзентаваць аўтара як яркага прадстаўніка экзістэнцыяльнай традыцыі.

Героем апавядання «Труба» выступае былы настаўнік і цяперашні загадчык сельскага клуба Валерый Сарокін. Драматызм і абсурднасць сітуацыі ў творы вызначаецца ў тым, што падвыпіўшага настаўніка, які схаваўся ад дажджу ў газавую трубу на пабудове і заснуў, заварылі. «Выхад на самой справе зьнік, яго заварылі, засыпалі і зараўнялі, – во ў чым справа» [2, с. 314]. Чалавек прачынаецца ў крамешнай цемры, замураваны ў трубе і разумее, што выйсця няма. Ён адразу сутыкаецца з цэлым спектрам экзістэнцыяльных перажыванняў. «Упершыню Валера адчуў спалох ад адзіноты і пакінутасці. Хаця ён усё яшчэ не мог канчаткова пагадзіцца з думкай, што яго заварылі ў трубе... У тое, што той стык завараны ў час ягонага п’янага сну, ён не мог паверыць. Не магло такога здарыцца. Не павінна здарыцца. Інакш...» [2, с. 297]. Адзінота, пакінутасць, спалох, страх, адчай, надзея, праблема выбару і свабоды – усімі гэтымі перажываннямі надзяляе Быкаў свайго героя. Здаецца, больш абсурднай сітуацыі немагчыма і ўявіць, але сэнсавая нагрузка гэтай абсурднасці сімвалічна. Чалавек у трубе і яго справы – «труба». Прычым, як зазначае Быкаў праз думкі Валерыя, «як у кроплі вады адбіваецца акіян, так і ў яго дурным выбары адбілася палітыка. Палітыка ягонай краіны дужа была падобна да яго» [2, с. 291]. Абсурд, такім чынам, не толькі ў сітуацыі былога сялянскага настаўніка, абсурд – частка існавання ўсяго народа. Усе запаяныя ў трубе, выйсця няма, у які бок рухацца, вырашыць немагчыма, што рабіць далей – таксама. Адчай даводзіць чалавека да ваганняў «Галоўнае, – усё ня мог зразумець, у які канец выбірацца. Увесь час здавалася: то ў той, то ў іншы. Самы элементарны выбар – адзін варыянт з двух, і на той ён аказаўся няздольны» [2, с. 300]. На самай справе, нават і ў такой сітуацыі таксама існуе выбар, застацца ці паўзці, маўчаць або зваць на дапамогу. Калі выбар будзе няправільны, то «ён ужо не жыхар на сьвеце, ён – перасяленец пад зямлю». І вось у такой страшэннай сітуацыі, згубіўшы сувязь са светам, адрынуты ім раней і запаяны ім зараз, чалавек упершыню становіцца свабодным, разумее, што ўсё залежыць толькі ад яго, маўчаць або крычаць – вырашаць толькі яму. Амаль што ўсё сваё жыццё ён, завербаваны ў КДБ, маўчаў. А зараз ён пачаў крычаць. Валерый сам з сабой разважае: «Ну, навошта ён робіць гэта – крычыць пад зямлёй, калі яго ніхто не чуе? Напэўна, ніхто не пачуе, а крычаць усё роўна хочацца. Бо надта доўга ён маўчаў. Баяўся! Усяго баяўся! Нават самаго сябе. Цяпер яму ўжо не страшна. Цяпер ён вызваліўся ад усяго. І ад страху таксама» [2, с. 317]. Быкаў тут выразна пераклікаецца з ідэяй Сартра пра экзістэнцыяльную свабоду ў сітуацыі выбару. Быкаў, як і іншыя экзістэнцыялісты, сцвярджае, што сапраўдная свабода, аўтэнтычнае існаванне, набываецца толькі перад тварам смерці або ў сумежнай сітуацыі. Сартр сцвярджае ў п’есе «За зачыненымі дзвярамі», што страх ёсць там, дзе ёсць надзея. Яго гераіня Інэс гаворыць, што «мы паміраем заўсёды зарана або занадта позна. Жыццё заканчваецца – трэба падводзіць вынікі. Ты – увасабленне свайго ўласнага жыцця» [3, с. 554]. Такія вынікі і падводзіць быкаўскі герой. Ён успамінае ўсё сваё жыццё, свае памылкі, п’яныя куцяжы, здачу бутэлек, працу ў КДБ пад імем Клёнаў. І раптам да яго прыходзіць адчуванне свабоды, якога раней ніколі не было, і ён пачынае крычаць тое, пра што думаў усе гэтыя гады, але баяўся сказаць. «Гэй вы, старыя абармоты! Хопіць хапаць за ногі маладых! Дайце ім жыць. Сацыялізм ваш здох, хіба не бачыце! Ад яго на свеце смурод. Хутчэй закопвайце! А то будзе чума!» [2, с. 318].

Вобраз чумы ў Быкава мае такое ж метафарычнае значэнне, як і ў творы Камю «Чума». Камю сцвярджае, што мікроб чумы ніколі не памірае і, магчыма, прыйдзе час, калі «чума абудзіць пацукоў і адправіць іх здыхаць на вуліцы шчаслівага горада» [4, с. 340]. Для Камю чума – гэта ўлада фашызму, для Быкава – камунізму, ды і ўвогуле абодва пісьменнікі выступаюць з крытыкай таталітарнай сістэмы. Неабходна ўзгадаць і філасофскі твор Камю «Бунтар», дзе філосаф асуджае таталітарную сістэму, як фашызму, так і камунізму. Вядома, Быкаў вельмі станоўча ставіўся да пазіцыі Камю і згадваў: «Разумна ён гаварыў, Сартр, а я думаў, што ўсё ж праўда на баку ягонага земляка Камю, які зганіў СССР за канцлагеры, а Сартр за тое парваў з ім адносіны» [1, с. 242]. Быкаў называў раман Камю «Чума» «адным з самых лепшых твораў XX стагоддзя». Аднак жа ў сваіх філасофскіх разважаннях Быкаў ставіцца ўсё ж бліжэй да Сартра.

Сартраўская экзістэнцыяльная канцэпцыя, у якой ён сцвярджае, што існаванне папярэднічае сутнасці і асобе належыць эмацыянальнае перажыванне сваёй памкнёнасці да будучыні, набывае ў Быкава характар мэтанакіраванасці чалавека. Да паняцця мэтастраты Быкаў дадае паняцце сэнсастраты і звязвае яе таксама з панаваннем абсурду ў грамадстве. «Кепска, калі ў чалавека адна мэта;

напэўна, у грамадства – таксама. Адна мэта можа аказацца фальшывай. Або недасяжнай. І тады – крах! Як во зараз. І няма вінаватых. Бо, як кажуць, ідэя правільная, а во яе ўвасабленне ў жыццё... Але што ж гэта за ідэя, калі яе нельга ўвасобіць і яна прыгодная хіба для бібліятэчных фондаў ды абароны дысертацый... Усё ж людзі розныя. І чалавек – не тэлеграфны слуп» [2, с. 316]. Відавочна, што пазіцыя Быкава супадае з пазіцыяй Сартра. Трэба ўзгадаць сартраўскую фразу: «Чалавек – гэта перш за ўсё праект самаго сябе, а не мох, не плесня і не каляровая капуста» [ 5, с. 323]. Чалавек у Быкава з'яўляецца такім, якім з'яўляецца яго праект быцця, як і ў экзістэнцыяльнай філасофіі Сартра.

Праблема свабоды і адказнасці ва ўмовах таталітарнай сістэмы – асноўная тэма апавяданняў Быкава апошніх гадоў. Свабода з'яўляецца вялікім цяжарам у жыцці чалавека. Па словах Сартра, кожнае дзеянне, кожнае рашэнне дае метастазы ў будучыню, гэта значыць, што свабода з'яўляецца адным з галоўных фактараў, якія канстытуіруюць чалавечую дзейнасць. Важнае значэнне ў экзістэнцыяльнай філасофіі надаецца ўсведамленню чалавекам самаго сябе як цэласнай асобы, якая здатная да самастойных учынкаў. Сартраўская свабода звязана з выбарам суб'ектам прадмета, мэты і характару дзеяння. А чым з'яўляецца свабода для Быкава?

Філасофскія разважанні В. Быкава пра свабоду маюць ярка выражаную экзістэнцыяльную накіраванасць і сугучныя з ідэямі Сартра і Камю, але і маюць свае адрозненні. Свабода, у разуменні Быкава, – «найбольш маральна-фізічная каштоўнасць, дадзеная кожнай жывой істоце фактам яе нараджэння. Усё жывое і карыстаецца тою каштоўнасцю, наколькі гэта мажліва ў складаным заблытаным сьвеце арганічнага існавання. Апроч хіба чалавека, якому мала прыроджанай свабоды. Каб у поўнай меры спазнаць і адчуць яе неабходнасць, яму наканавана прайсці праз хітрасплецены лабірынт жыцця, а то і застацца ў адным зь яго тупікоў. І там прызвычаіцца, змарнець, страціць прыроджаны дар свабоды, адаптавацца дзеля элементарнае мэты біялагічнага існавання. Зрабіцца часткай натоўпу, грамадства, электарату – такім, як усе» [1, с. 535].

Такім чынам, быкаўская інтэрпрытацыя свабоды звязана з неабходнасцю «зрабіцца часткай натоўпу», каб потым вырвацца з яго. Калі ў чалавека не было вопыту страты свабоды, ён ніколі не адчуе яе значнасці. Для чалавека, на думку Быкава, важным з'яўляецца зрабіць для сябе асноўны выбар: пераадолець залежнасць ад соцыуму шляхам творчай рэалізацыі і здзяйснення самаго сябе або «прыстасавацца, каб дамагчыся бесканфліктнага існавання» [1, с. 536]. Герой аповесці «Труба» пачынае разумець каштоўнасць свабоды, і з ім адбываюцца метамарфозы, якія Сартр тлумачыць як працэс неантызацыі, які звязаны з пачатковым этапам трансцэндзіравання асобы. Гэты працэс звязаны з сумежнай сітуацыяй, калі паміраюць старыя формы чалавечага існавання і нараджаюцца новыя, як вынік адмаўлення старых каштоўнасцей. Быкаўскі герой знаходзіць свабоду ў трубе і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. У трубе ён «недасяжны, незалежны. У трубе ўсё ж свабода» [2, с. 318]. Быкаў сцвярджае, што секундная свабода, набытая ў безвыхадных абставінах, даражэйшая за шматгадовае пакорнае прыстасаванне. «Свабода! – закрычаў ён. – Сарокін свабодны! А Клёнаў?.. А і Клёнаў таксама» [2, с. 318]. Быкаў сцвярджае пра свайго героя, што «яму было добра ў трубе – спакойна і незалежна. Што яму там, у жыцці? Згрызоты і няволя. Тут жа – спакой і свабода... Упершыню Валера Сарокін набыў голас і стаў адважным» [2, с. 319]. Набыць голас – гэта значыць усвядоміць самаго сябе. Калі ўзгадаць працу Сартра «Быццё і Нішто», то магчыма гаварыць пра сугучнасць пазіцыі Быкава сартраўскай ідэі пра свядомасць, якую ён сцвярджае як свабоду падняцца над сітуацыяй. Таму герой Быкава і адважваецца крычаць, выражаць сябе. Сартр сцвярджае магчымасць набыцця свабоды праз мастацтва і літаратуру. Мова, на думку экзістэнцыялістаў, – гэта апошняе апірышча свабоды. Быкаў перафразіруе гэту думку ў сваім творы такім чынам: «калі чалавек ня можа на справе, тады выйсцем для яго робіцца слова. Мабыць, слова – апошні аргумент свабоды». «Слова» магчыма тут разглядаць не толькі як сябетворчасць, але і як творчасць увогуле, якая таксама з'яўляецца неабходнай часткай самасвядомасці.

Быкаўскі герой народжаны савецкай таталітарнай сістэмай, якая рабіла чалавека вінцікам у сваім складаным механізме. У апавяданні Быкава «Перад канцом» стары гаворыць: «Свабода – гэта сімвал, філасофская катэгорыя. Свабода наогул. Народу яна без патрэбы, народ і ня ведае, што з ёй рабіць. Бо ён ніколі з ёй ня меў справы. Народу патрэбна, каб над ім гаспадарылі, гэта ў ягонай крыві» [2, с. 200]. З праблемай свабоды ў Быкава непарыўна звязана і праблема выбару. Выбар з'яўляецца заўсёды і выбарам самаго сябе, сваёй будучыні. Герой апавядання «Труба» выбірае больш не рухацца. Яго выбар – застацца на адным месцы і сканаць. Для яго ўжо не важна, шукаюць яго ці не, ці будзе турбавацца яго жонка, – ён прыйшоў да свайго лагічнага фіналу ў жыцці. Абсурднасць яшчэ аднаго выбару свайго героя Быкаў паказвае напрыканцы апавядання. «Валеру Сарокіна

знайшлі ў трубе на сёмы дзень ягонай прапажы. Ён не дапоўз да газакампрэсарнай станцыі нейкіх дзьвесце метраў; яго пачулі мантажнікі, якія па мабільным тэлефоне звязаліся з тэхслужбай... Ён быў яшчэ жывы, але да рэанімацыі не датрываў». Быкаў сцвярджае, што выбар «не рухацца» вядзе да смерці. Жыццё – гэта дзеянне, нават калі яно абсурдна і безнадзейна, гэта заўсёды свабода, свабода ўласнага выбару. Толькі зрабіўшы ўласны выбар, магчыма адчуць сябе чалавекам.

Экзістэнцыяльныя героі Быкава – ахвяры палітычнага абсурду камуністычнай сістэмы, ахвяры сацыяльных абставін. У адрозненні ад сартраўскіх герояў, не яны адварочваюцца ад соцыуму, а гэта соцыум адмаўляе іх. Пакінутыя сваім грамадствам, нават гнаныя ім, героі сутыкаюцца з адзінотай, «якая набывае формы трагічнай раз'яднанасці са светам» [6, с. 207]. Усялякія памкненні асобы ў такіх абставінах з'яўляюцца безвыніковымі, і чалавек страчвае надзею і адчувае бессэнсоўнасць існавання. Такім чынам, адчужанасць чалавека нараджае відавочны абсурд. Праблема чалавечага існавання ў быкаўскай прозе непарыўна звязана з катэгорыямі свабоды і выбару. Свабода, для Быкава, «скіроўваецца ў бок абмежаванасці ўплыву сацыяльнага фактару» [6, с. 211]. На думку аўтара, чалавек набывае ўласную годнасць і самасвядомасць толькі ў тым выпадку, калі аддзяляецца ад палітыкі і ад грамадства. Бунт быкаўскіх герояў часцей за ўсё праяўляецца ў ярка выражаным пратэсце супраць абставін і абсурду сістэмы, якія часцей за ўсё вымушаюць героя перастаць змагацца, скончыць жыццё самагубствам, ахвяраваць сабою, спадзеючыся на лепшую долю іншых.

Такім чынам, аналіз дадзенага твора дазваляе канстатаваць, што разуменне чалавека В. Быкавым аналагічна разуменню чалавека ў французскім экзістэнцыялізме. Праблема свабоды і выбару, прадстаўленыя аўтарам, дазваляе ўбачыць у асобе В. Быкава самабытнага прадстаўніка экзістэнцыяльнага напрамку і далучыць аўтара да пра-даўжальніка французскай экзістэнцыяльнай тра-дыцыі ў беларускай літаратуры.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Быкаў, В.* Доўгая дарога дадому: кн. успамінаў / В. Быкаў. – Мінск, 2004.
2. *Быкаў, В.* Поўны збор твораў: у 14 т. / В. Быкаў. – Мінск; М., 2005. – Т. 1: Аповесці, апавяданні і прыпавесці 90-х і 2000-х гадоў.
3. *Сартр, Ж.-П.* Пьесы / Ж.-П. Сартр. – М., 1999.
4. *Камю, А.* Избранное / А. Камю. – М., 1990.
5. *Сартр, Ж.-П.* Экзистенциализм – это гуманизм / Ж.-П. Сартр // Сумерки богов / Ж.-П. Сартр. – М., 1989.
6. *Локун, В.І.* Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры: манаграфія / В.І. Локун. – Мінск, 2005.


*Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 24.10.2008 г.*